# «КОЖНАЯ ПЯТНІЦА – РОДНАЕ, СВАЁ»

**Пад такой назвай напрыканцы мінулага года ў нашай краіне стартаваў масштабны нацыянальны праект, запушчаны Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь. Яго мэта – паказаць багацце і якасць беларускіх тавараў, падкрэсліць іх канкурэнтаздольнасць і зрабіць падтрымку нацыянальнага вытворцы добрай традыцыяй. У лютым да рэспубліканскай акцыі далучыліся Машэраўцы.**

### Юлія ГАПАНЁНАК, прарэктар па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце ВДУ імя П.М. Машэрава:

– Шматлікі калектыў нашага ўніверсітэта заўсёды падтрымлівае важныя і карысныя ініцыятывы. Не засталіся ў баку Машэраўцы і ў гэты раз: студэнты, выкладчыкі, работнікі і ліцэісты прымаюць актыўны ўдзел у масштабнай беларускай акцыі «Кожная пятніца – роднае, сваё». На мой погляд, гэты праект – выдатная магчымасць кожнаму з нас яшчэ раз прыгадаць, адкуль нашы карані. Прачытаць кнігу на беларускай мове, паслухаць беларускамоўнага артыста, прыгатаваць любімую страву нацыянальнай кухні, набыць прыгожае адзенне і якасны абутак.

Дарэчы, я таксама набываю беларускія тавары, вельмі люблю стравы нацыянальнай кухні і лічу іх самымі лепшымі. Дранікі, бабка, мачанка, клёцкі падабаюцца і замежным гасцям. А вырабы з беларускага льну, безумоўна, – найлепшы падарунак.

### Таццяна ОРУП, дацэнт кафедры музыкі, кіраўнік Народнага мужчынскага хору выкладчыкаў і студэнтаў ВДУ імя П.М. Машэрава:

– Народны мужчынскі хор выкладчыкаў і студэнтаў ВДУ імя П.М. Машэрава прымае актыўны ўдзел у праекце «Кожная пятніца – роднае, сваё». У рэпертуары калектыву ёсць шмат твораў беларускіх кампазітараў і на беларускай мове («Пасадэна», «Беларускае папуры», «Мама Марыя» і інш.). Удзельнікі хору выконваюць песні Я. Алейніка «Сапраўдны беларус», В. Шмата «Мы не маем межаў», В. Карпанава «Водар Айчыны», «Беларуская мова», «Хата бацькоў», «Маё дзяцінства», Я. Курчыча «Спадчына продкаў». Творчы калектыў выступае ў Палацы Рэспублікі і на розных канцэртных пляцоўках гарадоў Беларусі.

Трэба адзначыць, што я і мая сям'я заўсёды набываем тавары толькі беларускіх вытворцаў. Мы любім прадукцыю Віцебскай кандытарскай фабрыкі «Віцьба», Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі «Ганна», прысмакі ад «Віцебскхлебпрам», малочныя прадукты «Лепелька», касметыку брэнда «Беліта», абутак «Марка».

У вольны час люблю гатаваць. Любімыя стравы беларускай нацыянальнай кухні маёй сям'і – дранікі, халаднік, бульбяная бабка са скваркамі, налiснiкi.

### Марыя МАРАЖАНАВА, кіраўнік аддзела сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай работы ВДУ імя П.М. Машэрава:




– У рамках акцыі мы прапанавалі рубрыку «Псіхалагічныя словы-амулеты». Ідэя нарадзілася не проста з-за любві да роднай мовы. Яна вырасла з разумення таго, як слова фармуе рэальнасць. Вядома, што ў старажытнасці людзі лічылі абярэгі не толькі ўпрыгожваннямі, але і носьбітамі важных пажаданняў і сэнсу, пры гэтым гаварылі: «Каб слова не стала ветрам». А Леў Сямёнавіч Выгоцкі – наш суайчыннік, чалавек, які нарадзіўся і сфармаваўся як вучоны менавіта на беларускай зямлі, – зрабіў адкрыццё, якое перавярнула сусветную псіхалогію: слова не проста абазначае думку, яно стварае думку. Таму сапраўдны рух наперад немагчымы без засваення культурнага досведу, які перадаецца менавіта праз слова. Якім чынам кожную пятніцу выбіраюцца словы? Каштоўнасці – не проста словы, а арыенціры, якія задаюць кірунак жыцця і вызначаюць, што для чалавека важна. А словы, якія абазначаюць каштоўнасці на беларускай мове, – вельмі паэтычныя, з глыбокай філасофіяй.

Дарэчы, я і мае родныя дома вельмі любім разам прыгатаваць і з'есці бабку і дранікі – вядомыя традыцыйныя стравы беларускай кухні. А калі мае дзеці былі маленькія, я ўключала ім самую прыгожую і далікатную, на мой погляд, «Калыханку» у выкананні «Песняроў». Яны нават часам прасілі ўключыць ім «пра любага хлопчыка».

### Таццяна УЛАСЕВІЧ, старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі:

– У першую пятніцу лютага прадстаўнікі мастацка-графічнага факультэта далучыліся да акцыі «Кожная пятніца – роднае, сваё», накіраванай на папулярызацыю беларускіх традыцый і культурнай спадчыны. Разам з Аксанай Аляксандраўнай Пачкінай мы сустракалі супрацоўнікаў Віцебскай абласной клінічнай інфекцыйнай бальніцы. Падчас мерапрыемства госці нашага ўніверсітэта наведалі Музей мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава, дзе змаглі пазнаёміцца з унікальнымі экспанатамі і гісторыяй беларускага мастацтва. Адным з яркіх момантаў сустрэчы стаў майстар-клас па пляценні саломкі. Гэта старажытнае рамяство, якое зараз уваходзіць у спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, стала важным элементам культурнай ідэнтычнасці Беларусі. Удзельнікі майстар-класа даведаліся аб традыцыйных тэхніках пляцення і змаглі паспрабаваць свае сілы ў стварэнні ўнікальных вырабаў з саломы. Наогул мастацка-графічны факультэт з'яўляецца захавальнікам беларускай культуры. А ўдзел прадстаўнікоў МГФ у такіх праектах яшчэ раз падкрэслівае важнасць захавання культурнай спадчыны і яе ролі ва ўмацаванні нацыянальнай ідэнтычнасці.

Думаю, у кожнай сям'і «беларуская» пятніца можа стаць добрай традыцыяй. А для гэтага дастаткова накрыць стол з беларускімі прадуктамі высокай якасці, напрыклад, ад Глыбоцкага малочнакансервавага камбіната, ААТ «Савушкін прадукт», ААТ «Бабуліна крынка» і інш. Таксама можна прыгатаваць розныя стравы беларускай кухні – мачанку, бабку, дранікі і г.д. Нельга не прыгадаць і беларускі трыкатаж вядомых брэндаў «Світанак» і «Любава», разнастайны асартымент якіх дазваляе апрануць усю сям'ю.

### Уладзімір ВЫСОЦКІ, дырэктар студэнцкай сталовай ВДУ імя П.М. Машэрава:

– Пярловы суп з грыбамі, дранікі з мясам, салянка па-беларуску, мачанка з грыбамі – гэтыя і іншыя смачнейшыя стравы беларускай нацыянальнай кухні работнікі нашай сталовай прапанавалі паспрабаваць Машэраўцам, а таксама гасцям нашага ўніверсітэта ў рамках рэспубліканскай акцыі па пятніцах. Варта адзначыць, што ўсё прыгатаванае карысталася вялікім попытам сярод наведвальнікаў і атрымала толькі станоўчыя водгукі. На мой погляд, беларускія стравы – унікальныя. Іх рэцэпты – самабытныя, а смак – запамінальны, непаўторны і яркі. Між тым і ў штодзённае меню нашай сталовай уключаны стравы беларускай кухні, і іх даволі шмат. Гэта малочная зацірка, боршч халодны на кефіры, разнастайныя салаты, напітак з журавін і інш.

Дома я таксама люблю гатаваць стравы беларускай кухні. Напрыклад, клёцкі з мясам, дранікі з мясам. Акрамя таго, імкнуся набываць розныя тавары айчынных вытворцаў, якія стабільна радуюць сваёй якасцю. І раю ўсім рабіць «беларускім» кожны дзень, а не толькі пятніцу.

**Падрыхтавала Вікторыя АЛЯКСАНДРАВА.**

ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П. М. МАШЭРАВА
МЫ і ЧАС
Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П. М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33. Тэл. 58-97-92.
Газета надрукавана афсетным спосабам ва УПП «Віцебская абласная друкарня». ЛП №38200000007680 от 30.04.2004 г. ул. Щербакова-Набережная, 4, г. Витебск, 210015
Падпісана да друка 28.02.2026 г. у 16.30. Тыраж 730. Аб'ём 2 друк. арк. Зак. 917.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць 1 раз на месяц.

Галоўны рэдактар В. В. БАГАТЫРОВА
Рэдактар А. А. ДУБРОЎСКАЯ